УДК 398(476.4)

# ФАНЕТЫЧНЫЯ І МАРФАЛАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ГОРАЦКАГА РАЁНА

**Селібірава Л. У.,**
*канд. філал. навук, дацэнт*
*Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія,*
*г. Горкі, Рэспубліка Беларусь*

Даследаванне асаблівасцей народных гаворак з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснай беларускай дыялекталогіі.

Гаворкі Магілёўшчыны, як і гаворкі іншых тэрытарыяльных адзінак Беларусі, патрабуюць далейшага вывучэння і ўдакладнення. У нашым даследаванні разгледзім фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці гаворак Горацкага раёна.

Горацкі раён размешчаны ў паўночна-ўсходняй частцы Магілёўскай вобласці. На поўначы ён мяжуе з Дубровенскім і Аршанскім раёнамі Віцебскай вобласці, на захадзе – са Шклоўскім, на поўдні – з Дрыбінскім і Мсціслаўскім раёнамі Магілёўскай вобласці, на ўсходзе – з Краснінскім і Манастыршчынскім раёнамі Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

Гаворкі Горацкага раёна адносяцца да ўсходняй (віцебска-магілёўскай) групы паўночна-ўсходняга дыялекту.

Крыніцай для даследавання фанетычных і марфалагічных асаблівасцей гаворак Горацкага раёна паслужыў фактычны дыялектны матэрыял, сабраны намі падчас размовы з мясцовымі жыхарамі вёсак Кузавіна, Вялікая Каралёўка, Нівішчы, Целяшоўка, Тосна, аграгарадка Паршына.

На фанетычным узроўні ў даследаваных гаворках Горацкага раёна выяўляюцца рысы, уласцівыя беларускай літаратурнай мове. Напрыклад, пашырана дзеканне і цеканне (*дзеўкі, дзень, бацька, адзець, цяплець*), асіміляцыя зычных па мяккасці (*зь дзіцёнкам, разьбіць, жызьнь, есьць*), асіміляцыя па звонкасці і глухасці (*прозьба, казьба, цяшка, місарупка*), падаўжэнне зычных (*сьвінні, осінню, пячэнне, чценне*).

Найбольш значнае адрозненне сістэмы зычных мясцовых гаворак ад іншых беларускіх гаворак і літаратурнай мовы – гэта суіснаванне двух розных зычных гукаў [р] і [р'], што характэрна для віцебска-

магілёўскай групы гаворак. Цвёрды гук [р] з'яўляецца агульнаўжывальным у маўленні вяскоўцаў, выяўляецца нават у русізмах: *старый, буракі, брові, цітрадзь, рынак* і інш. Мяккі зычны [р'] таксама актыўна ўжываецца мясцовымі жыхарамі: *урем'я, грібы, электріка, трі, резаць, пірямыіць, пірятрець* і інш.

Сістэму ненаціскнога вакалізму гаворак Горацкага раёна, як і ўсяго паўночна-ўсходняга дыялекту, характарызуе дысімілятыўнае аканне і яканне. Пад уплывам якаснай рэдукцыі адбываецца распадабненне галосных аднолькавага пад'ёму пад націскам і ў першым складзе перад націскам, пры гэтым распадабненне можа назірацца і ў іншых ненаціскных складах.

Пры дысімілятыўным аканні ў першым складзе перад націскам пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных, калі пад націскам [а], вымаўляецца не [а], а гук няпоўнага ўтварэння [ъ]: *въйна́, дъва́й, пъжа́р, кълп́аць, въда́* і інш. Але калі пад націскам знаходзяцца іншыя галосныя, у першым пераднаціскным складзе вымаўляецца [а]: *пасмо́трім, каро́вы, касі́ў, хадзі́ла* і інш. Дысімілятыўнае аканне пашырана таксама ў пераднаціскных і паслянаціскных складах, у якіх галосныя [а] і [о] пасля цвёрдых зычных супалі ў гуку [ъ]: *пъмъга́лі, дзе́лълі, бъсяко́м, на скъвърадзе́* і інш.

У даследаваных гаворках Горацкага раёна пашырана дысімілятыўнае яканне пасля мяккіх зычных. Калі ў слове ў моцнай пазіцыі [а], то ў першым складзе перад націскам пасля мяккіх зычных вымаўляецца [і]: *німа́, цьвіта́мі, усігда́, дзіржа́лі* і інш. Калі ў моцнай пазіцыі знаходзяцца іншыя галосныя, то ў першым пераднаціскным складзе вымаўляецца [а]: *нядо́ўга, вясно́й, цьвято́ў* і інш.

Адной з марфалагічных асаблівасцей гаворак Горацкага раёна з'яўляецца тое, што пад уплывам рускай мовы і яе дыялектаў у формах давальнага і меснага склонаў адзіночнага ліку ў назоўніках I і II скланенняў не назіраецца чаргавання заднеязычных [г], [к], [х] са свісцячымі [з'], [ц], [с']: *на руке, на наге, на страхе, к дачке, у малаке, у муке* і інш.

У месным склоне адзіночнага ліку для назоўнікаў I і II скланенняў ужываецца канчатак *-і*: *на фермі, у школі, у класі, у саўхозі, у тым годзі* і інш.

Формы 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга і будучага простага часу дзеясловаў I спражэння абвеснага ладу маюць фіналь *-ць*. Гэта адна з асноўных марфалагічных асаблівасцей паўночна-ўсходняга дыялекту: *жывець, ідзець, чытаіць, цячэць, расцець, думаіць* і інш.

У формах 3-й асобы множнага ліку для дзеясловаў II спражэння характэрны канчаткі -*уць* (-*юць*): *просюць, топюць, сушуць, жарюць, варюць* і інш.

У формах 2-й асобы адзіночнага ліку і 1-й асобы множнага ліку для дзеясловаў I спражэння пад уплывам дысімілятыўнага акання і якання ўжываюцца канчаткі -*іш* (-*ыш*), -*ім* (-*ым*): *купляіш, чытаіш, аддыхаім, бегаім*.

Для зваротных дзеясловаў, акрамя літаратурнага постфікса -*ся*, характэрны постфікс -*сь*: *мыюсь, улыбаюсь, абувайцісь, смейцісь, адзівайцісь* і інш.

У горацкіх гаворках адзначаюцца формы прыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, неасабовых займеннікаў мужчынскага роду назоўнага склону на -*ій* (-*ый*): *красівый, бальшый, яркій, мелкій, новый, другій, трецій, пятый, якій, каторый* і інш.

Як і ў літаратурнай мове, у множным ліку ўжываюцца поўныя формы прыметнікаў, лічэбнікаў і займеннікаў на -*ыя: худыя, харошыя, бальшыя, пятыя, шастыя, нікаторыя* і інш.

Зафіксаваны таксама спецыфічныя формы ўтварэння вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў: *лепій, паболій, дальшы, большы ўсяго, раньшы* і інш.

У адзначаных гаворках пашырана часціца *ні*: *ні хачу, ні нада, ні магу, ні сёння, ні знаў, ні хадзіла, ні ўсігда* і інш.

Замест беларускага прыназоўніка *да* ўжываецца рускамоўны прыназоўнік *к*: *пріеду к табе, падайдзі к магазіну* і інш.

Такім чынам, на аснове фанетычнага і марфалагічнага аналізаў гаворак даследаваных вёсак, размешчаных у Горацкім раёне, вызначаны спецыфічныя асаблівасці, характэрныя для віцебска-магілёўскай групы паўночна-ўсходняга дыялекту: дысімілятыўнае аканне і яканне, адрозненне [р] і [р’], адсутнасць чаргавання заднеязычных [г], [к], [х] са свісцячымі [з’], [ц], [с’], фіналь -*ць* у формах 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга і будучага простага часу дзеясловаў I спражэння абвеснага ладу, постфікс -*сь* у зваротных дзеясловах, канчаткі -*ій* (-*ый*) у формах прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў мужчынскага роду назоўнага склону і інш.

ЛІТАРАТУРА

1. Блінава, Э. Д. Беларуская дыялекталогія: вучэб. дапам. / Э. Д. Блінава, Е. С. Мяцельская. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 1991. – 304 с.

2. Крывіцкі, А. А. Дыялекталогія беларускай мовы / А. А. Крывіцкі. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 294 с.